2. Багдановіч, М. Поўны збор твораў : у 3 т. / М. Багдановіч. – 2-е выд. – Мінск, 2001. – Т. 2 : Маст. проза, пераклады, літаратурныя артыкулы, рэцэнзіі і нататкі, чарнавыя накіды.
3. Янішчыц, Я. З Максімам Багдановічам / Я. Янішчыц // Максім Багдановіч. Пясняр чыстае красы: успаміны, артыкулы, прысвячэнні / уклад. Т. Шэляговіч. – Мінск, 2011. – С. 226–232.

*Гоўзіч І.М. (Мінск)*

## Медытатыўная лірыка Максіма Багдановіча і Анатоля Вярцінскага

Лірыка як у ХХ, так і ў ХХІ ст. застаецца адным з самых дынамічных і «рухомых» родаў літаратуры, які вольна карыстаецца не толькі катэгорыямі прасторы і часу, але і стварае іх псіхалагічныя двайнікі, бо галоўнай задачай пісьменніка становіцца пошук сугуччаў слоў, што выклікаюць у свядомасці рэцыпіента чуйныя, складаныя, поўныя ўяўленні. Лірыка ніколі не замыкалася «ў сферы ўнутранага жыцця людзей, іх псіхалогіі <…> Яе нязменна вабяць душэўныя станы, што знамянуюць засяроджанасць чалавека на навакольнай рэчаіснасці» [9, с. 134], яна па-мастацку асвойвае «не толькі чалавечую псіхалогію і свядомасць, але і, натуральна, быццё» [6, с. 134].

У развіцці лірычнага слоўнага мастацтва выразна вылучаюцца тры жанрава-стылёвыя пачаткі – эмацыянальна-выяўленчы (прадметнаапісальны), дыдактычна-павучальны (нораваапісальны, эталагічны) і медытатыўны. Ступень іх праявы ў творчасці асобных аўтараў і ў канкрэтных творах неаднолькавая, залежыць ад многіх фактараў, адзін з якіх – фактар часу. Так, напрыклад, у перыяд антычнасці мастацтва вырашала асноўную задачу – адлюстраванне свету, стварэнне яго мадэлі паводле чалавечага ўяўлення, па падабенстве з ім, адсюль і пераважная выяўленчасць, пластычнасць твораў старажытнагрэчаскіх паэтаў.

Медытатыўнасць – найбольш выразная, дамінантная рыса лірыкі, якая «можа быць пераважна скіравана да самааналізу, утрымліваць у сабе эмацыянальную ці мысліцельную рэфлексію» [6, с. 64]. Менавіта рэфлексія думкі і пачуцця аўтара, іх рух, змены складаюць адметнасць лірыкі як роду літаратуры. Заўважым, аднак, што медытатыўнасць па-рознаму ўвасабляецца ў творах: гэта і эмацыянальнасць,

і апісальнасць з адзнакамі медытатыўнасці, і чыстая медытацыя, нават тады, калі «лірычныя творы нібы пазбаўлены медытатыўнасці і знешне ў асноўным апісальныя, яны толькі пры той умове з'яўляюцца паўнацэнна мастацкімі, калі іх апісальнасць насычана медытатыўным падтэкстам» [7, с. 158]. Часта ў падобнай паэзіі лірычны герой непасрэдна выяўляе свае пачуцці з пэўным элементам медытатыўнасці (разважлівасці) ці аказваецца поўнасцю падуладным самарэфлексіі, адгароджваецца ад рэцыпіента, нібы забываецца на яго, ці разважае пра лёс грамадства, выказвае свае філасофскія погляды на жыццё і смерць, арыентуючыся на чытача, пастаянна маючы яго на ўвазе.

Генезіс медытатыўнай лірыкі адбыўся значна пазней, чым этала-гічнай і выяўленча-апісальнай, бо для ўзнікнення псіхалагізму, а пазней аналітызму ў творах, паводле меркавання рускага літаратуразнаўца, «патрэбны дастаткова высокі ўзровень развіцця культуры грамадства ў цэлым, але, галоўнае, трэба, каб у гэтай культуры непаўторная чалавечая асоба ўсведамлялася як каштоўнасць» [4, с. 315].

Такія спрыяльныя ўмовы ў соцыуме складваліся не адзін раз на працягу некалькіх тысячагоддзяў (і ў Антычнай Грэцыі, і ў эпоху Адраджэння), але найбольшае распаўсюджанне медытатыўнасць як адзнака лірыкі атрымала ў XIX – пачатку XX стагоддзя ў Расіі (Я. Баратынскі «Усё думка, ды думка!..», М. Някрасаў «Я за тое глыбока ненавіджу сябе…», А. Пушкін «Пара, мой сябар, пара!..» і інш.), у Еўропе (М. Метэрлінк «Запальнае шкло», А. Рэмбо «Зло», П. Элюар «Смерць. Каханне. Жыццё» і інш.) і на Беларусі (цыкл «Каханне і смерць» М. Багдановіча). Слоўная творчасць названых паэтаў сведчыць пра арыгінальны сінтэз думкі і пачуцця, канкрэтнага і абстрактнага як адметную рысу медытатыўнай лірыкі.

М. Багдановіч у пачатку мінулага стагоддзя імкнуўся тэарэтычна і на практыцы асэнсаваць праблемы філасофскай лірыкі. Так, у артыкуле «Поэзия гениального учёного» ён зазначаў: «И поэзия, и наука имеют, в конце концов, одну и ту же цель: удовлетворение познавательной потребности человека <…> Следует лишь оговориться, что формы, в которых они закрепляют свои достижения, не только не тождественны, но даже противоположны. Наука даёт схему, формулу; поэзия – живой конкретный образ. Однако уже в методах, которыми оперирует каждая из них, мы не находим столь твёрдой разграни-

ченности» [2, с. 195]. Аўтар упершыню ў айчынным літаратуразнаўстве і крытыцы выказаў тэзіс пра сінтэз, падобнасць дзвюх форм светаўспрымання – мастацкага / паэтычнага і навуковага, якія ў ранні перыяд развіцця чалавецтва не знаходзіліся ў супярэчнасці, забяспечвалі цэласнасць духоўнага свету чалавека. На жаль, падобная цэласнасць разамкнулася ў пазнейшы перыяд: «…поэтическое мировоззрение совершенно оторвано от мировоззрения научного; они чужды друг другу, не согласованы между собой… <…> и, в конце концов, наша духовная сфера оказывается расколотой надвое» [2, с. 195].

Яскравыя ўзоры нацыянальнай філасофскай лірыкі якраз і стварыў аўтар цытаваных вышэй радкоў. У вершах-медытацыях М. Багдановіч найперш застаецца філосафам-кніжнікам, падкрэслівае прыярытэтнасць думкі, мыслення, імкнення стрымаць хвалі пачуццяў берагамі разважлівасці, узважанай ацэнкі, падпарадкаваць іх мэце адкрыцця новых момантаў, зрухаў у жыцці прыроды, чалавека, малым і вялікім, сціснутым у кропку і пашыраным да касмічных абсягаў, што прывяло да строга выверанай кампазіцыі зборніка «Вянок», напісання цыкла «Каханне і смерць», вершаў «Мяжы», «Жывеш не вечна, чалавек...», «Трыялет» («Калісь глядзеў на сонца я…») і інш.

Паэзія М. Багдановіча строгая, прадуманая, адсюль і цвёрдыя вершаваныя формы санет, трыялет, рандо, актавы, тэрцыны, якія даюць магчымасць аўтару максімальна выявіць сябе ў абмежаванай прасторы твора. Паэтава думка ў медытатыўнай лірыцы напружана пульсуе, развівае кожны тэзіс доказам:

Жывеш ня вечна, чэлавек, –
Пералсыві-ж у момэнт век!

Каб хвалювалося жыцьцё,
Каб больш разгону ў ім было,
Каб цераз край душы чуцьцё
Не раз, не два пайшло!

Жыві і цэльнасьці шукай,
Аб шырацe духоўнай дбай,

І ў напружэньні паўнаты
Свайго шырокаго жыцьця
Бяз болю, ціха зойдзеш ты
Ў краіну забыцьця [1, с. 76].

Працытаваны верш пра пошук духоўнай цэльнасці як канчатковую мэту існавання, пра перавагу духоўнага пачатку над матэрыяльным, пра жыццё-гарэнне, жыццё-самааддачу і смерць, не страшную таму, хто самарэалізаваўся пры жыцці. Важкай думцы ў медытацыі адпавядае і форма: верш складаецца з двух зыходных тэзісаў («Жывеш ня вечна, чэлавек...», «Жыві і цэльнасьці шукай...»), вылучаных кампазіцыйна і максімальна лаканічных, і іх доказаў.

Працэс разгортвання думкі, пачаты Максімам Кніжнікам, працягваецца ў творчасці шматлікіх паэтаў XX–XXI стст. – Максіма Танка (вершы з кніг «Глыток вады», «Errata»), А. Куляшова (філасофскія элегіі са зборніка «Новая кніга»), Р. Барадуліна (творы са зборніка «Абсяг»), Я. Сіпакова (медытатыўныя элегіі са зборніка «У поўдзень, да вады»), А. Вярцінскага (прытчы і медытацыі са зборніка «Хлопчык глядзіць...»), А. Разанава (версэты, вершаказы, квантэмы, пункціры і інш.). Варта зазначыць, што на сучасным этапе развіцця мастацтва слова канчаткова выпрацаваўся варыянт медытатыўнай паэзіі, у якой адбываецца агульная актывізацыя мысліцельнай энергіі і канцэнтрацыя думкі дзякуючы ўшчыльненню яскравай выяўленчасці, асацыятыўнай вобразнасці, трапнасці мастацкіх дэталей, якія ўдала працуюць на падтэкст, скандэнсаванасць зместу. Аднак ступень абстрагавання і медытатыўнасці ў творчасці сучасных беларускіх паэтаў значна большая, чым у іх папярэднікаў, а філасофская думка «ўціснутая» ў больш значны адрэзак часу.

Асновай мастацкай творчасці А. Вярцінскага і дамінантай сістэмнага пазнання свету ў мастацкіх вобразах з’яўляецца даследчатворчы пачатак. Яго творчасць – не павярхоўнае адлюстраванне ўбачанага, а ацэнка, пераацэнка, аналіз рэчаіснасці, ён «трывала абраў адзін з самых малараспрацаваных у паэзіі шляхоў – інтэлектуальна-філасофскае асэнсаванне быцця і шматграннасці яго праяў, інтэграцыі нацыянальнага ў агульначалавечы кантэкст» [8, с. 259]. Пры такім падыходзе эмацыянальнасць і пачуццёвасць «працуюць» на «аздабленне» новастворанай пабудовы, упрыгожваюць строгі і стройны каркас, сілуэт «дрэва-верша», яго магутны ствол голлем і лісцем, апранаюць, вобразна гаворачы, на яго вопратку, ды так, каб рыштаванні былі малапрыкметныя ці зусім непрыкметныя чытачу-рэцыпіенту.

Верш А. Вярцінскага «Просьба» – не толькі крэда паэта, якому хочацца бачыць усіх людзей людзьмі, «чалавекамі», але і яркі ўзор

стылю, дзе няма нічога лішняга, поўнасцю адсутнічаюць экзатычныя тропы, разгортваецца ўнутраная дыялогавая дыскусія на тэму «Быць чалавекам», паўстае над усім думка, а высокі адычны настрой ствараецца сістэмай паўтораў, перастаноўкай слоў, клічнай інтанацыяй, зваротками і іншымі сродкамі паэтычнага сінтаксісу: *«Не прашу я доўгага веку, / Не прашу асаблівай любві. / Я прашу цябе: “Будзь чалавекам!” / Я прашу вас: “Будзьце людзьмі!” / Нельга ж вечна жыць, як некалі. / Час другі зусім – глядзі. / Людзі! Будзьце чалавекамі / Чалавекі! Будзьце людзьмі!»* [3, с. 233]. А. Вярцінскі ў падобных вершах абапіраецца на гуманістычна-цэласны філасофска-эстэтычны светапогляд і актыўна прапагандуе яго, стварае лірыку «рацыяналістычнай развагі, інтэлектуаліста, якая выклікае пачуццё ўзрушанасці, супераживання разваротам думкі, логікай сілагізмаў і вывадаў» [5, с. 141].

Пры чытанні вершаў А. Вярцінскага адчуваецца, наколькі спрасаваная, скандэнсаваная ў кожным радку, кожным слове сэнсавая энергія, і не менш скандэнсаванае дзеянне ў творах паэта, якія ў пераважнай большасці з’яўляюцца дыялогамі ў традыцыйным разуменні гэтага паняцця («Варыяцыі на тэму: «Гефест – друг Праметэя») ці спалучэннем маналогаў у адно цэлае, якое і ўтварае своеасаблівую размову аўтара з героямі твораў ці з іх рэцыпіентамі («Вялікія думкі – як сонца з-за хмар…», «Высокае неба ідэала» і інш.). Для падобнай лірыкі, па выказванні В. Русілкі, характэрныя «напружаны інтэлектуальны пошук, філасофскае даследаванне маральна-этычных праблем, высокая ступень абстрагаванасці і сэнсавай канцэнтрацыі паэтычнага слова» [8, с. 271], што і дае магчымасць сцвердзіць думку пра ўзбагачэнне аўтарам беларускай філасофскай лірыкі, а таксама пра пэўную нейтралізацыю лірычнага элемента ў яго творчасці, бо непасрэднай «сардэчнай» цеплыні ў ёй меней, чым у традыцыйнай беларускай і рускай паэзіі.

### Літаратура


1. Багдановіч, М. Вянок : кніга выбраных вершаў / М. Багдановіч [факсімільнае выданне]. – Мінск, 2011.
2. Багдановіч, М. Поўны збор твораў : у 3 т. / М. Багдановіч. – 2-е выд. – Мінск, 2001. – Т. 2 : Маст. проза, пераклады, літаратурныя артыкулы, рэцэнзіі, нататкі, чарнавыя накіды.

3. Вярцінскі, А. Хлопчык глядзіць…: выбр. вершы і паэмы / А. Вярцінскі. – Мінск, 1992.
4. Есин, А.Б. Психологизм / А.Б. Есин // Введение в литературоведение. Литературное произведение: основные понятия и термины : учеб. пособие / Л.В. Чернец [и др.]; под ред. Л.В. Чернец. – М., 2000. – С. 313–328.
5. Лойка, А. Сустрэчы з днём сённяшнім / А. Лойка. – Мінск, 1968.
6. Поспелов, Г.Н. Лирика: среди литературных родов / Г.Н. Поспелов. – М., 1976.
7. Поспелов, Г.Н. Проблемы исторического развития литературы / Г.Н. Поспелов. – М., 1972.
8. Русілка, В. Вучыць чалавечнасці (Штрыхі да літ. партрэта Анатоля Вярцінскага) / В. Русілка // Полымя. – 1997. – № 5. – С. 259–274.
9. Хализев, В.Е. Лирика / В.Е. Хализев // Введение в литературоведение. Литературное произведение: основные понятия и термины : учеб. пособие / Л.В. Чернец [и др.]; под ред. Л.В. Чернец. – М., 2000. – С. 133–141.

*Грамадчанка Т.К. (Мінск)*

## Катэгорыя прыгожага ў эстэтычнай сістэме Максіма Багдановіча

У літаратуразнаўстве існуюць два блізкія, аднак, не сінанімічныя паняцці – п р ы г о ж а е і п р ы г а ж о с ц ь (прекрасное и красота). Апошняя, хоць таксама з'яўляецца адной з важнейшых катэгорый эстэтыкі, выступае паняццем больш вузкім, яна раскрывае і ацэньвае асобныя бакі эстэтычных вартасцей канкрэтных прадметаў і з'яў рэчаіснасці.

М. Багдановіч шырока выкарыстоўваў у творчасці слова *к р а с а*, напаўняючы яго разнастайным і складаным зместам: *«краса жывая», «краса радзімая», «краса даўняя», «цвятоў расістых чыстая краса», «двайной красы аблік ядыны», «прад высокаю красою»* і інш. Слова п р ы г о ж ы, якое таксама сустракаецца ў паэзіі і прозе пісьменніка (*«узор прыгожы пекных зор», «радкі кірыліцы прыгожай»*, «прыгожы, лёгкі пыл»), адназначнае, яно нясе агульную, часам знешнюю і не заўжды сутнасную характарыстыку ўзноўленай рэчы ці прыроднай з'явы. Так, у вершы «Перапісчык» яно служыць для паказу абставін,